## Што Вам трэба ведаць?

Грамадзяне Польшчы, а таксама іншых краін ЕС не могуць атрымаць МА ў Польшчы.

●

МА ≠ азыль (azyl), гэта розныя працэдуры і статусы.

Азыль — гэта ўнікальная форма абароны, якая выкарыстоўваецца, у тым ліку, калі ў гэтым ёсць асаблівыя інтарэсы Польшчы.

●

Падаць заяўку на МА можна не толькі падчас перасячэння мяжы на памежным пераходзе.

Калі сітуацыя ў Вашай краіне паходжання пагоршылася падчас Вашага знаходжання ў Польшчы, Вы можаце падаць заяву ў бліжэйшай пляцоўцы памежнай службы.

●

Падаць заяву на МА можна таксама падчас перабывання без дакументаў.

Напрыклад, калі тэрмін дзеяння Вашай візы або праязнога дакумента скончыўся або Вы перасеклі мяжу, парушаючы правілы. Аднак раім пазбягаць такіх рызыкоўных сітуацый, бо Вас могуць змясціць пад варту ў цэнтр для іншаземцаў.

●

Калі падчас працэдуры Вы жывяце па-за цэнтрам для іншаземцаў, Вы маеце права на сацыяльную дапамогу.

Яна не прадастаўляецца аўтаматычна, трэба падаць адпаведную заяву ў UDSC.

●

Вы не можаце працаваць на працягу першых 6 месяцаў пасля падачы заяўкі на МА.

Аднак, калі ў Вас ёсць свабодны доступ да рынку працы (напрыклад, Вы скончылі дзённае навучанне або вышэйшую адукацыю ў Польшчы, у Вас ёсць дзейсная гуманітарная віза і г.д.), Вы можаце працаваць.

Польскія ўпраўленні, суды, службы не могуць дзяліцца інфармацыяй адносна працэдуры МА з уладамі Вашай краіны паходжання.

●

Падчас працэдуры Ваш праязны дакумент (напрыклад, пашпарт) будзе ў дэпазіце, Вы не зможаце ім карыстацца.

Улічвайце гэта і па магчымасці займіцеся важнымі справамі напярэдадні падачы заяўкі (адкрыццё рахунку у банку, уладкаванне на працу, прапіска і інш.). Мы рэкамендуем таксама рабіць завераныя копіі старонак пашпарта, асабліва з персанальнымі дадзенымі або дзейснай візай і г.д.

●

Пасля таго, як Вы атрымалі МА, Вы не павінны звязвацца з уладамі Вашай краіны або павяртацца дамоў. Гэта можа прывесці да ануляванне прадастаўленай абароны.

**Прыходзьце на бясплатную кансультацыю ў цэнтры горада!**

- Przejście Dialogu, вул. Świdnicka 19 (прастора ў падземным пераходзе)

**Тэлефануйце або пішыце!**

- wromigrant@wcrs.pl
- +48 717 724 950
  +48 538 579 517
  +48 735 969 992 (Viber)
  +48 538 579 555 (Viber)
- @wromigrant (Messenger)

@wromigrant

# Міжнародная абарона

Кароткі даведнік для уцекачоў і ўцякачак, падрыхтаваны Пунктам WroMigrant

wrocławskie centrum rozwoju społecznego

WRO MIGRANT
Punkt informacji dla migrantów i uchodźców

Wrocław
miasto spotkań

## Міжнародная абарона (МА)

прадастаўляецца замежнікам у дзяржаве, якая не з'яўляецца краінай іх паходжання (у тым ліку ў Польшчы). Асновай для прадастаўлення міжнароднай абароны з'яўляецца **абгрунтаваная боязь**, што дадзеная асоба можа стаць ахвяраю **пераследу** або пацерпіць **сур'ёзную шкоду** ў сваёй краіне паходжання. Пры гэтым яна не можа або не жадае звяртацца па абарону да ўладаў сваёй краіны.

Пераследаванні, якія ўлічваюцца ў працэдуры прадастаўлення МА, павінны ўяўляць сабою сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека (у першую чаргу гэта парушэнні права на жыццё, а таксама рабства, катаванні і іншае) **на падставе расы, нацыянальнасці, рэлігіі, палітычных перакананняў або прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы**. Гэта могуць быць як асобныя дзеянні, так і сукупнасць дзеянняў або бяздзейнасць.

МА можа быць прадастаўлена ў выглядзе **статусу ўцекача** або **дадатковай абароны**. Форма абароны вызначаецца начальнікам Упраўлення па справах іншаземцаў (UDSC, ul. Taborowa 33, Warszawa).

**У ПРАЦЭДУРЫ ПАДАЧЫ ЗАЯВЫ НА МА НЕ ПАТРЭБНЫ ПАСРЭДНІК!**

**ВЫ МОЖАЦЕ ЗРАБІЦЬ ГЭТА САМАСТОЙНА У ПАДРАЗДЗЯЛЕННІ ПАМЕЖНАЙ СЛУЖБЫ І ПРАЙСЦІ ЎСЮ ПРАЦЭДУРУ ЦАЛКАМ БЯСПЛАТНА!**

# Этапы працэдуры

1. Асабістая падача заявы ў бліжэйшым падраздзяленні Памежнай службы (ul. Graniczna 105a, Wrocław)

2. Затрыманне праязнога дакумента іншаземца (напрыклад, пашпарта) ў дэпазіце.

3. Выданне Часовага пасведчання асобы іншаземца (TZTC).

4. Перадача справы да UDSC.

5. Верыфікацыя дадзеных (вуснае або пісьмовае сумоўе).

6. UDSC вызначае, ці заяўнік кваліфікуецца для атрымання адной з форм міжнароднай абароны.

---

**REFUGEEBOOK**

мабільны дадатак для асоб, якія падаюць заяву на МА ў Польшчы

## ПАЗІТЫЎНАЕ РАШЭННЕ

▼ Наданне канкрэтнай формы абароны — статусу уцекача або дадатковай абароны.

- **Статус уцекача**
  Падача заявы на выдачу Жэнеўскага пашпарта і карты побыту.

**АБО**

- **Дадатковая абарона**
  Падача заявы на зварот з дэпазіту праязнога дакумента і выдачу карты побыту.

▼ Падача заявы на Індывідуальную Праграму Інтэграцыі (IPI) на працягу 60 дзён з моманту атрымання пазітыўнага рашэння.

## АДМОЎНАЕ РАШЭННЕ

▼ Магчымасць падаць апеляцыю ў Савет па справах уцекачоў на працягу 14 дзён.

▼ У выпадку паўторнага адмоўнага рашэння — магчымасць на працягу 30 дзён падаць скаргу ў Ваяводзкі адміністрацыйны суд у Варшаве.

▼ Канчатковае адмоўнае рашэнне і выдача пастанаўлення аб добраахвотным выездзе з краіны.